# Будзь са Мной

*Сл. і муз. Алена Сітнік*

1 КУПЛЕТ:
**Em           Am              G**
  Калі глядзіш у вышыню,
**        C          G              F                  Em      Am**
Там зоркі мігцяць, маўкліва сьвецяць на зямлю.
**Em          Am             G**
Суціш імклівых думак бег,
**  C        G          F                Em      Am**
І гэты абшар раскажа праўду пра цябе.

Калісьці Бог стварыў наш сьвет,
Нябёсы Свае на гэтую зямлю спусьціў.
Ласкавы позірк, шчырасьць слоў
Краналі цябе. Заўсёды быў ты з Ім, любіў;

*1 ПРЫСЬПЕЎ:*
***H7                  Em          Am                  H7***
*А Ён казаў: «Будзь са Мной, з табой я буду вечна.*
***Em          Am            H7***
*Кожны дзень чакаю Я сустрэчы.*
***Em      Am           H7***
*Бо любоў Мая табе належыць.*
***Em        Am               H7***
*Зноў і зноў кажу, што ты – Мой лепшы.»*

2 КУПЛЕТ:
Што раптам здарылася тут?
Чаму ўсе маўчаць, калі усё вакол крычыць?
Крыжуюць веру – Божы дар,
Марнуюць жыцьцё, якое даў Сьвяты Ўладар.

*2 ПРЫСЬПЕЎ:*
*Ня чуюць: «Будзь са Мной, з табой я буду вечна.*
*Кожны дзень чакаю Я сустрэчы.*
*Бо любоў Мая табе належыць.*
*Зноў і зноў кажу, што ты – Мой лепшы.»*

3 КУПЛЕТ:
Калі сьціскае сэрца боль,
Няма сіл ісьці і верыць у любоў, каб жыць,
Я ўспамінаю, як Ты йшоў
Маўкліва на крыж, каб сёньня мелі моц любіць.

*3 ПРЫСЬПЕЎ:*
*І я кажу: «Будзь са мной, з Табой я буду вечна.*
*Кожны дзень чакаю я сустрэчы.*
*Бо любоў мая Табе належыць.*
*Зноў і зноў кажу, што Ты – мой лепшы.»*